Падтрымай "Вясну" на PATREON

На два гады калоніі асудзілі мінчука за кінуты ў міліцэйскі аўтобус шкляны келіх

07.09.2021 **Тэгі**: суды, крымінальны пераслед



Фота ілюстрацыйнае, udf.name

У судзе Цэнтральнага раёна Мінска 7 верасня вынесены прысуд па крымінальнай справе Аляксандра Зайкоўскага. Яго абвінавацілі па артыкуле 364 КК РБ (Гвалт альбо пагроза прымянення гвалту ў дачыненні да супрацоўніка органаў унутраных спраў).

Вяла працэс суддзя **Юлія Густыр**, дзяржаўны абвінаваўца - **Нічыпарук.**

На папярэднім пасяджэнні пракурор запрасіў для Зайкоўскага два гады пазбаўлення волі ў калоніі агульнага рэжыму.

Як вядома з матэрыялаў справы, 12 кастрычніка 2020 года прыкладна ў 21 гадзіну Зайкоўскі ў стане алкагольнага ап'янення на праспекце Дзяржынскага з іншымі неўстаноўленымі асобамі, аказваў супраціўленне работнікам міліцыі, пагражаў ім прымяненнем гвалту, кінуў у бок міліцэйскага аўтобуса піўны келіх.



Чатыры амапаўцы "пацярпелі" ад звону разбітага келіха і прад'явілі пазоў на 4 000 рублёў

Зайкоўскі шпурлянуў піўным куфлем у бок аўтобуса і патрапіў у яго крыху вышэй за кола. Пашкоджанняў не заўважыў. Адразу яго затрымалі, паклаўшы тварам у асфальт, а потым загрузілі ў аўтазак.

У судзе Зайкоўскі патлумачыў, што ў той вечар проста гуляў без ніякай мэты. У бары выпіў 50 грамаў каньяку. Затым зазірнуў яшчэ ў адзін бар за півам. Там пазнаёміўся з двума мужчынамі, якія пачалі яго выклікаць на спрэчку, правакаваць. Маўляў, а слабо кінуць бакалам у міліцэйскі аўтазак (чырвоны аўтобус без апазнавальных знакаў, які стаяў побач). Зробіш – кватэру падорым. Больш гэтых мужчын ніхто не бачыў.

Суддзя Густыр 7 верасня вынесла рашэнне – прызнаць Зайкоўскага вінаватым і асудзіць яго на **два гады пазбаўлення волі ў калоніі агульнага рэжыму.** Дадаткова - накіраваць на прымусовае лячэнне ад алкагалізму.

Таксама Зайкоўскі павінен выплаціць чатыром амапаўцам па 1 000 рублёў кампенсацыі маральнай шкоды.

Твитнуть







Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных

WWW.GAZETABY.CO

ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА

"Калі адказ не падабаўся, то білі". У СІЗА-1 падчас жорсткай праверкі збівалі вязняў

Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур'ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"



ГАЛОЎНАЕ

Рэпрэсаваны "Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску







АПОШНІЯ НАВІНЫ

"Народжаная пад дубінкамі на Чарнобыльскім шляху". Як пачыналася "Вясна"

У Мінску судзяць стрыечнага брата намесніка камандзіра палка Каліноўскага Вадзіма Кабанчука: пракурор просіць тры гады калоніі

Міжнародная супольнасць віншуе “Вясну” з днём народзінаў

Мужчыну асудзілі на год "хіміі" за сарваны сцяг

"Мы не хочам быць заложнікамі", – вясноўцы на акцыі ў Вільні

Затрыманні і арышты: хроніка палітычнага пераследу 24-26 красавіка (дапоўнена)

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць

"Суды згубілі сваю функцыю, а грамадзянская супольнасць перанесла знішчальную атаку". Павел Сапелка — на канферэнцыі АБСЕ

Праваабарончая праграма "Вясна" на Беларускім Радыё Рацыя

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць



Рэферэндум 2022





Напрамкі дзейнасці

ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская інтэрнэт-бібліятэка

СЯБРОЎСТВА

ENEMO

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

















E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY